УДК 008:316.7

# САЦЫЯЛОГІЯ КУЛЬТУРЫ І КУЛЬТУРСАЦЫЯЛОГІЯ ЯК КАНКУРЭНТЫ КУЛЬТУРАЛОГІІ

***А. Д. Крывалап,*** *кандыдат культуралогіі, дацэнт кафедры культуралогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*

**Анатацыя.** Артыкул прысвечаны разгляду канцэпцый сацыялогіі культуры і культурсацыялогіі ў сучасных сацыяльна-гуманітарных ведах. У першым набліжэнні разглядаюцца адрозненні паміж моцнай і слабой даследчымі праграмамі сацыялогіі. Падкрэсліваецца прынцыповы характар разумення аўтаноміі культуры і яе адасобленасці ад сацыяльных інстытутаў. Разгледжаны працы даследчыкаў Д. Александэра і У. Абушэнкі. Зроблена спроба акрэсліць магчымасці разумення культурсацыялогіі як выкліка для культуралогіі.

**Ключавыя словы:** культурсацыялогія, сацыялогія культуры, моцная праграма, культуралогія.

# SOCIOLOGY OF CULTURE AND CULTURAL SOCIOLOGY AS A COMPETITORS FOR CULTUROLOGY

***A. Krivolap,*** *Candidate of Cultural Science, Associate Professor of the Department of Culturology of the Educational Institution «Belarusian State University of Culture and Arts»*

**Abstract.** The text is devoted to the consideration of the concepts of sociology of culture and cultural sociology in modern social and humanistic knowledge. A first approximation examines the differences between a strong and a weak research program in sociology. The fundamental nature of understanding the autonomy of culture and its autonomy from social institutions is emphasized. The article examines the works of such researchers as: J. Alexander and U. Abushenka. This text seeks to first outline the possibilities of understanding cultural sociology as a challenge for cultural studies.

**Keywords:** cultural sociology, sociology of culture, strong program, culturology.

Сёння культуралогія не валодае манапольным правам на даследаванні ў галіне культуры. Іншыя сацыяльна-гуманітарныя дысцыпліны маюць уласныя адгалінаванні ў падыходах да вывучэння культуры. Асобнае месца сярод іх займае сацыялогія, якая прапануе адразу некалькі варыянтаў даследчай працы з культурай: ад сацыялогіі культуры да культурсацыялогіі. І гэта не толькі гульня словамі і цяжкасці перакладу. На прыкладзе стаўлення сацыялогіі да працы з культурай магчыма заўважыць парадыгматычны зрух у разуменні таго, як успрымаецца культура і як магчыма яе даследаваць.

Зразумела, што культура не з'яўляецца сінонімам мастацтва, а значыць, існуе неабходнасць даследаваць не толькі і не столькі культурныя формы вольнага часу, колькі практыкі штодзённасці, лад жыцця і іншыя «дробныя» праявы сацыяльнага. «Пры гэтым неабходна "разводзіць" паняцці "социум" і "культура", "падзяляць" сацыякультурныя працэсы на два складнікі. Такую магчымасць дае ўяўленне пра дзве рэчаіснасці, у якіх існуюць культурныя зместы, – сацыяльнай як прасторы дзеяння жывучых пакаленняў, як прасторы тут-і-зараз актуалізаванай культуры, і знакавай, тэкставай, якая прэзентуе культурную памяць і досвед усіх пакаленняў людзей, самаідэнтыфікаваных у дадзенай культуры» [1, с. 287].

Гэты падзел на дзве рэчаіснасці культуры і соцыуму часам прымаецца за дысцыплінарную мяжу, якая падзяляе культуралогію і сацыялогію. Аднак дадзеная празмерная рэдукцыя не можа адлюстраваць наяўнасць усёй глыбіні праблемы ў даследаванні культуры. Таму спачатку варта патлумачыць адрозненне сацыялогіі культуры ад культурсацыялогіі, а таксама сэнс метафары моцнай і слабой праграмы.

У сваім праграмным тэксце «Моцная праграма ў культурсацыялогіі» Д. Александэр адзначае, што пры ўсім падабенстве і сугучнасці сацыялогія культуры і культурсацыялогія маюць і прынцыповыя адрозненні. Сацыялогія культуры выступае як адно з магчымых адгалінаванняў сацыялогіі накшталт сацыялогіі моладзі, працы, сям'і і інш. Для культурсацыялогіі культура мае істотна большую самастойнасць ці, у тэрмінах Д. Александэра, аўтаномію. Гаворка ідзе не пра адміністрацыйна-тэрытарыяльныя межы шматлікіх культурных аўтаномій, а менавіта пра іншае разуменне культуры як сацыяльнага феномена, калі культура адыгрывае значную ролю ў вызначэнні дзеянняў і ўтварэння сацыяльных інстытутаў. Гэта патрабуе яе разгляду на ўзроўні вытворчых сіл, тэхналогій і іншых матэрыяльных складнікаў.

Сацыялогія культуры і культурсацыялогія для непадрыхтаванага даследчыка вельмі падобныя: яны выкарыстоўваюць агульную тэрміналогію, даследуюць каштоўнасці і дыскурсіўныя практыкі, а таксама пагаджаюцца з тым, што культура адыгрывае істотную ролю для грамадства і вартая пільнага сацыялагічнага вывучэння. Аднак у падыходах да гэтага вывучэння і выяўляюцца прынцыповыя адрозненні. Так, сацыялогія культуры грунтуецца на тым, што «культура – гэта тое, што трэба тлумачыць чымсьці іншым, цалкам адасобленым ад самой сферы сэнсу. <...> У такім падыходзе культура вызначаецца як «мяккая» (*soft*), не зусім незалежная пераменная: яна больш-менш абмяжоўваецца ўдзелам у прайграванні сацыяльных адносін» [3, с. 13]. Культурсацыялогія разглядае культуру ў якасці аўтаномнай самадастатковай сацыяльнай сістэмы, што можа быць зразумела і спазнана без прыцягнення нейкіх знешніх канцэптаў і сістэм. Калі навуковае бачанне свету з'яўляецца культурна дэтэрмінаваным і трэба зразумець магчымыя

ўзроўні сэнсу, не варта звяртацца да знешніх канцэптаў, трэба спрабаваць разабрацца, аналітычна падзяляючы сацыяльныя структуры і культуру. Менавіта гэты падзел паміж сацыяльнымі структурамі і культурай забяспечвае культурную аўтаномію. Тое, што культурсацыялогія «прызнае культурную аўтаномію, з'яўляецца самай важнай якасцю моцнай праграмы» [3, с. 13]. У той жа час сацыялогія культуры прапаноўвае слабую праграму, для якой культура з'яўляецца залежнай пераменнай для сацыяльнага жыцця.

Цікава, што канцэпцыя размежавання сацыялогіі культуры і культурсацыялогіі мае паслядоўнікаў і ў беларускай сацыялогіі. На думку беларускага сацыёлага У. Абушэнкі, калі сацыялогія культуры разглядаецца як спроба «апісання і аналізу культуры на ўзроўні тэорыі сярэдняга ўзроўню ў аспекце ўключанасці культурнага кампанента ў сацыяльнае жыццё грамадства і яго падсістэм і ў аспекце выяўлення спецыфічнай сферы культуры як на ўзроўні інстытуцый, так і паводзін, то ў выпадку з культурсацыялогіяй гаворка ідзе пра вывучэнне культуры сродкамі сацыялогіі на метатэарэтычным узроўні аналізу» [2, с. 125].

Дадзены артыкул варта разглядаць як спробу рэфлексіі стану культуралагічных ведаў у дачыненні да вывучэння культуры і канстатацыю наяўнага адставання культуралогіі ад культурсацыялогіі. Падсумоўваючы, магчыма зрабіць першыя высновы адносна таго, якім чынам культурсацыялогія і сацыялогія культуры могуць канкурыраваць з культуралогіяй у пытаннях даследавання культуры. У сённяшнім выглядзе культуралогія прапануе чарговую «слабую праграму» ў дачыненні да вывучэння і разумення культуры, калі параўноўваць яе з культурсацыялогіяй. Іншымі словамі, для культуралогіі бліжэйшым канкурэнтам можа выступаць сацыялогія культуры, якія разам імкнуцца тлумачыць свет праз стварэнне тэорый сярэдняга ўзроўню, тады як заяўленая Д. Александэрам культурсацыялогія прэтэндуе на метаапісанне і разуменне аўтаноміі культуры на больш высокім канцэптуальным узроўні.

1. *Абушенко, В. Л.* Разрыв традиций: поиски механизма новой идентификации / В. Л. Абушенко // Основания культурсоциологии : избр. тр. В. Л. Абушенко / сост. А. В. Комаровский. – Минск, 2016. – С. 285–296.

2. *Абушенко, В. Л.* Типологический подход к исследованию культуры в культурсоциологии / В. Л. Абушенко // Социологический альманах : сб. науч. ст. / Ин-т социологии НАН Беларуси. – Минск, 2012. – Вып. 3. – С. 124–140.

3. *Александер, Д.* Сильная программа в культурологии / Д. Александер, Ф. Смит // Социологическое обозрение. – 2010. – Т. 9. – № 2. – С. 11–30.